# СТЫПЭНДЫЯЛЬНАЯ ПРАГРАМА

# УРАДУ РЭСПУБЛІКІ ПОЛЬШЧА

# імя КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА

## ПАД ПАТРАНАТАМ СТАРШЫНІ РАДЫ МІНІСТРАЎ РП

## Адмысловы набор

## Падрыхтоўчы курс (люты – верасень 2011) да VI цыклу Праграмы на навучальны год 2011/2012

Падставай стварэньня Праграмы зьяўляецца "Ліст намераў", падпісаны 30 сакавіка 2006 году ў Актавай залі імя Адама Міцкевіча ў Варшаўскім унівэрсытэце Старшынём Рады міністраў РП сп. Казімежам Марцінкевічам, сп. Аляксандрам Мілінкевічам, прадстаўніком Аб'яднаных дэмакратычных сілаў Беларусі ды прадстаўнікамі Канфэрэнцыі рэктараў польскіх акадэмічных школаў (KRASP) і Канфэрэнцыі рэктараў польскіх унівэрсытэтаў (KRUP), у прысутнасьці некалькіх соцень студэнтаў, навуковых супрацоўнікаў ды гасцей урачыстасьці.

У I годзе дзейнасьці Праграмы, у ліпені 2006 году, прынятыя 244 асобы, якія распачалі навучаньне на 77 розных факультэтах, у 37 вышэйшых навучальных установах у 15 гарадох Польшчы.

У II годзе дзейнасьці Праграмы, у верасьні 2007 году, прынятая 71 асоба, якіх накіравалі ў 15 гарадоў Польшчы, у 23 ВНУ, дзе яны пачалі навучанне на 24 розных факультэтах.

У III годзе дзейнасьці Праграмы, у верасьні 2008 году, прынятыя 58 асобаў, якіх накіравалі ў 11 гарадоў Польшчы, у 22 ВНУ, дзе яны пачалі навучанне на 26 розных факультэтах.

У IV годзе дзейнасьці Праграмы, у верасьні 2009 году, прынятыя 44 асобы, якіх накіравалі ў 14 гарадоў Польшчы, у 22 ВНУ, дзе яны пачалі навучанне на 26 розных факультэтах.

У V год дзейнасьці Праграмы, у верасьні 2010 году, прынятыя 53 асобы. З іх 43 былі скіраваныя ў 17 ВНУ, ў 11 розных гарадоў Польшчы, дзе яны распачалі навучаньне на 26 факультэтах. 10 чалавек прынялі на гадавы падрыхтоўчы курс. Гэта былі асобы, якія адпавядалі патрабаваньням Праграмы, але ім яшчэ ня споўнілася 18 гадоў.

KOORDYNATOR PROGRAMU

STUDIUM EUROPY WSCHODNIEJ UNIWERSYTET WARSZAWSKI

BIURO PROGRAMU:

Pałac Potockich, Krakowskie Przedmieście 26/28, 00-927 Warszawa

Tel. +48-22 55 21 888; fax +48-22 55 21 887; e-mail: bialorus.studium@uw.edu.pl; www.studium.uw.edu.pl

## I. ПРАВІЛЫ ПРАГРАМЫ

1. Стыпэндыяльная праграма носіць імя Кастуся Каліноўскага (нар. у 1838 г.), удзельніка студзеньскага паўстаньня 1861 году, упаўнаважанага паўстанцкага ўраду ў Вялікім Княстве Літоўскім, павешанага ў Вільні ў 1864 годзе, заслужанага таксама ў справе абароны беларускай нацыянальнасьці ды культуры, памяць пра якога вечна жывая сярод беларусаў.
2. Мэта праграмы – стварыць адукацыйныя шанцы тым студэнтам зь Беларусі, якія страцілі магчымасьць вучыцца ў беларускіх вышэйшых навучальных установах па палітычных прычынах. Яны маюць магчымасьць завяршыць навучаньне ў Польшчы, альбо працягваць вучыцца тут да часу, калі змогуць вярнуцца ў свае ВНУ на Радзіме.
3. Урад Польшчы запэўніць адпаведныя сродкі на стыпэндыі для студэнтаў з Беларусі, а польскія вышэйшыя навучальныя ўстановы, згуртаваныя ў Канфэрэнцыі рэктараў польскіх акадэмічных школаў (KRASP) і Канфэрэнцыі рэктараў польскіх унівэрсытэтаў (KRUP) ды астатнія ВНУ, якія бяруць удзел у стыпэндыяльнай праграме імя К. Каліноўскага, забясьпечаць навукова-дыдактычныя ўмовы для правядзеньня навучальнага працэсу.
4. Стыпэндыяльная праграма будзе рэалізоўвацца ў супрацоўніцтве з Міністэрствам замежных справаў і Міністэрствам навукі і вышэйшай адукацыі РП.
5. Пры Варшаўскім унівэрсытэце ў 2006 годзе было створанае Праграмнае бюро, задачай якога зьяўляецца падрыхтоўка дакумэнтацыі кандыдатаў на вучобу, апрацоўка заяваў ВНУ, якія прымаюць удзел у Праграме, забесьпячэньне Падрыхтоўчага курсу (у пэрыяд вакацыяў перад пачаткам асноўнага навучаньня) ды каардынацыя апекі стыпэндыятамі Праграмы пасьля разьмяшчэньня іх у ВНУ.
6. Дырэктарам і каардынатарам “Стыпэндыяльнай праграмы імя Кастуся Каліноўскага”, які кіруе працай бюро ды працай камісіяў, якія прымаюць кандыдатаў на навучаньне, зьяўляецца загадчык Студыюму Усходняй Эўропы Варшаўскага ўнівэрсытэту.
7. **Пасьля падзеяў 19 сьнежня 2010 г. прынятае рашэнне зарганізаваць адмысловы, дадатковы набор на Праграму. Кандыдаты будуць мець магчымасьць узяць удзел у Падрыхтоўчых курсах польскай мовы і культуры ў пэрыяд зь лютага па верасень 2011 г., па сканчэньні якіх іх накіруюць на навучаньне ў ВНУ.**

## II. КАНДЫДАТЫ

1. Удзельнікамі Праграмы могуць быць студэнты і асьпіранты беларускіх вышэйшых навучальных установаў, якія былі адлічаныя з ВНУ па палітычных прычынах, альбо якім па палітычных прычынах не дазволілі распачаць ці працягваць вучобу ў Беларусі. Апроч гэтага на ўдзел у Праграме могуць прэтэндаваць дзеці бацькоў, зьняволеных і рэпрэсаваных па палітычных матывах.
2. Кваліфікацыю кандыдатаў, у межах дзейнасьці Праграмнага бюро, правядзе камісія, створанай дзеля гэтай мэты дырэктарам Праграмы. Камісія будзе прапанаваць прыняцьце кандыдатаў на Падрыхтоўчы курс згодна з дасланымі заявамі, абапіраючыся на рэглямэнт Праграмы. Суразмоўі з кваліфікацыйнай камісіяй адбудуцца падчас прыезду кандыдатаў у Варшаву.
3. Прыняцьце на Праграму, а таксама разьмеркаваньне стыпэндыятаў па польскіх ВНУ зьдзейсьніць дырэктар Праграмы, абапіраючыся на заяўкі ВНУ і беручы пад увагу перадусім магчымасьць працягу навучаньня згодна з напрамкам, распачатым у Беларусі.
4. Магчымы набор у мэдычныя ВНУ, а асабліва ў мастацкія, будзе патрабаваць пацьвярджэньня вучэльнямі магчымасьці набору ў дадзеным годзе, а таксама праверкі імі прафэсійных кваліфікацыяў кандыдата. У выпадку аплікацыі

ў вышэйзгаданыя ВНУ кандыдат будзе прыняты на Праграму толькі пасьля залічэньня яго ў сьпіс студэнтаў дадзенай ВНУ, пасьля выкананьня ўсіх яе патрабаваньняў.

5. Камісіі альбо асобы, вызначаныя рэктарамі ВНУ (дэканамі), у якія будуць разьмеркаваныя студэнты, ужо ў межах паасобных факультэтаў ды інстытутаў правядуць ацэнку праграмных разыходжаньняў і акрэсьляць умовы іх скасаваньня.

## III. ПАДРЫХТОЎЧЫ КУРС

1. З мэтай падрыхтоўкі прынятых на Праграму стыпэндыятаў з лютага па верасень 2011 г. пройдзе Падрыхтоўчы курс. У яго ўвойдуць інтэнсыўныя заняткі па польскай мове ў выбраных польскіх вучэльнях, а таксама лекцыі, прысьвечаныя гісторыі ды культуры Польшчы і рэгіёну.
2. Падрыхтоўчы курс пачнецца ад прыкладна тыднёвага побыту стыпэндыятаў у Варшаве, у праграму якога ўвойдуць лекцыі, культурная праграма, а таксама наведванне найважнейшых установаў Польшчы.
3. Апроч гэтага цягам першага году асноўнага навучаньня стыпэндыяты Праграмы будуць праходзіць абавязковыя лекцыі польскай мовы, аплачаныя стыпэндыятам альбо ВНУ, калі так вынікае з яе ўнутраных правілаў.

## IV. УМОВЫ СТЫПЭНДЫІ

1. Працягласьць навучаньня будзе залежаць ад таго, на які курс студэнт будзе прыняты ў Польшчы. Максымальна (пры запісе на першы курс) вучоба можа працягвацца 5 гадоў.
2. Студэнты будуць вызваленыя ад аплатаў за навучаньне ў польскіх ВНУ
3. Падчас навучаньня на Падрыхтоўчым курсе ўдзельнікі Праграмы атрымаюць стыпэндыю ў памеры 900 злотых на месяц, а таксама аднаразовую суму дапамогі для ўладкаваньня ў Польшчы. З пачаткам асноўнага навучаньня ў кастрычніку 2011 г. стыпэндыя складзе 1240 злотых на месяц.
4. Падчас Падрыхтоўчаг курсу кошты мэдычнай страхоўкі стыпэндыятаў бярэ на сябе Праграма. Аднак з пачаткам асноўнага навучаньня (кастрычнік 2011 г.) абавязак аплаты мэдычнай страхоўкі кладзецца на стыпэндыята (каля 45 зл. на месяц). Апроч таго ён мусіць зьвярнуцца ў адпаведныя дзяржаўныя органы дзеля легалізацыі свайго побыту ў Польшчы ды атрымаць часовы від на жыхарства (каля 400 зл., дакумэнт выдаецца на 1 год).
5. Вышэйшыя навучальныя запрапануюць студэнтам платныя месцы ў інтэрнатах.
6. Падчас знаходжаньня на Падрыхтоўчым курсе студэнты будуць прымаць удзел у сустрэчах, арганізаваных Праграмным бюро, а таксама змогуць атрымаць дапамогу ў разьвіцьці кантактаў з польскімі ды незалежнымі беларускімі асяродзьдзямі.

## V. ДАКУМЭНТЫ

1. Запоўненая анкета “Кандыдата праграмы” (даступная на інтэрнэт-старонцы Студыюм Усходняй Эўропы: www.studium.uw.edu.pl/kk).
2. Заява на навучаньне ў Польшчы.
3. Дыплём заканчэньня сярэдняй школы (атэстат сталасьці).
4. Заліковая кніжка з вучобы ў ВНУ ў Беларусі.
5. Спіс залічаных прадметаў.
6. Праграма навучаньня ў беларускіх ВНУ дзеля вызначэньня праграмнай розьніцы.
7. Дакумэнт (пасьведчаньне) адлічэньня з ВНУ (калі яно мела месца).
8. Дакумэнт (пасьведчаньне) арышту альбо прысуду (калі яны мелі месца).
9. Іншыя дакумэнты, якія, на меркаваньне кандыдата, могуць мець значэньне для рашэньня Кваліфікацыйнай камісіі.

## VI. АПЛІКАЦЫІ

1. Кандыдат на Праграму можа даслаць камплект дакумэнтаў поштай ці факсам, альбо прынесьці іх асабіста ў адпаведную дыпляматычную пляцоўку Рэспублікі Польшча ў Беларусі. Копіі гэтых дакумэнтаў неабходна даслаць электроннай поштай у Бюро Праграмы ў Студыюм Усходняй Эўропы Варшаўскага унівэрсытэту.
2. Брашуры й анкеты будуць даступныя **ад 30 студзеня 2011 г.** у Праграмным бюро ды на інтэрнэт-старонцы, а таксама ў дыпляматычных і консульскіх пляцоўках РП у Беларусі.
3. Тэрмін прыняцьця дакумэнтаў сканчваецца **ў сярэдзіне лютага 2011 г.**
4. Пачатак Падрыхтоўчага курсу заплянаваны **на канец лютага 2011 г.**
5. Суразмоўі кандыдатаў з кфаліфікацыйный камісіяй адбудуцца пасьля іхнага прыезду ў Варшаву.
6. Рашэньне пра скіраваньне стыпэндыятаў у Вышэйшыя навучальныя ўстановы будзе агучаная пасля завяршэньня Падрыхтоўчага курсу – **каля 25 верасьня 2011 г.**

## VII. ПРАГРАМНАЕ БЮРО

1. Бюро Стыпендыяльнай праграмы імя Кастуся Каліноўскага знаходзіцца ў Варшаўскім унівэрсытэце пры Студыюме Усходняй Эўропы, ul. Oboźna 7, III p., lok. 55 (уваход ад вул. Sewerynów).
2. Кантактныя зьвесткі Пграграмнага бюро

Tel. 022 55 21 888, faks: 022 55 21 887,
e-mail: Białoruś.studium@uw.edu.pl;
інтэрнэт-старонка: www.studium.uw.edu.pl/kk.